Дапоўніце тэкст двума-трыма сказамі, выкарыстаўшы звесткі, прыведзеныя ў табліцы.

| Расліна | Час раскрыцця пялёсткаў | Час закрыцця пялёсткаў |
|---|---|---|
| Лілея | 5 | 20 |
| Белы гарлачык | 6—7 | 17—18 |
| Наготкі | 9 | 15—16 |

## § 60. Складаныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс

**370.** Разгледзьце схему.

**пяць** — *пяцьдзясят*, *пяцьсот*

**шэсць** — *шэсцьдзясят*, *шэсцьсот*

**сем** — *семдзесят*, *семсот*

**восем** — *восемдзесят*, *восемсот*

Зрабіце вывад аб правапісе мяккага знака ў складаных лічэбніках.

У сярэдзіне складаных лічэбнікаў *пяцьдзясят, шэсцьдзясят, пяцьсот, шэсцьсот, дзевяцьсот* пішацца мяккі знак.

**371.** Выкарыстоўваючы розныя спалучэнні простых і складаных лічэбнікаў з каранямі *пяць-, шэсць-, сем-, восем-, дзевяць-*, утварыце і запішыце сем састаўных колькасных лічэбнікаў.

**372.** Разгледзьце выявы папяровых грашовых знакаў Беларусі. Абгрунтуйце думку аб тым, што афармленне беларускіх банкнотаў адпавядае дэвізу «Мая краіна — Беларусь».





Правообладатель Национальный институт образования

Складзіце сказы пра тое, што адлюстравана на пярэднім баку беларускіх банкнотаў.

У з о р: *На пярэднім баку банкнота наміналам … рублёў размешчана выява … .*

Запішыце сказы, у якіх ужываюцца складаныя лічэбнікі.

Д л я д а в е д к і: *Мірскі замак; Нясвіжскі замак; Белая (Камянецкая) вежа; палац Румянцавых і Паскевічаў (г. Гомель); Нацыянальная бібліятэка Беларусі; Спаса-Праабражэнская царква (г. Полацк); Магілёўскі абласны мастацкі музей імя П. В. Масленікава.*

**373.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне складаных колькасных лічэбнікаў | |
|---|---|---|
| Н. | *семдзесят капеек* | *дзвесце кіламетраў* |
| Р. | *сямідзесяці капеек* | *двухсот кіламетраў* |
| Д. | *сямідзесяці капейкам* | *двумстам кіламетрам* |
| В. | *семдзесят капеек* | *дзвесце кіламетраў* |
| Т. | *сямюдзесяццю капейкамі* | *двумастамі кіламетрамі* |
| М. | *(аб) сямідзесяці капейках* | *(на) двухстах кіламетрах* |

З назоўнікамі якога роду ўжываюцца лічэбнікі *два, дзве*?

Пры скланенні складаных колькасных лічэбнікаў (ад ***пяцідзесяці*** да ***васьмідзесяці***, ад ***двухсот*** да ***дзевяцісот***) змяняюцца абедзве часткі слова.

Другая частка (лічэбнік ***сто***) мае формы ***-сот, -стам, -стамі, -стах.***

У лічэбніку ***дзвесце*** ва ўскосных склонах (акрамя вінавальнага) у якасці першай часткі выступаюць формы лічэбніка *два* (а не *дзве*): ***двух-, двум-, двума-.***

Лічэбнік ***дзевяноста*** ва ўсіх склонах мае аднолькавую форму.

**374.** Запішыце словамі лікі 50, 80, 600, 900. Складзіце з імі колькасна-іменныя словазлучэнні і праскланяйце іх (па варыянтах).



Правообладатель Национальный институт образования

**375.** Рашыце прыклады. Запішыце іх, замяняючы лікі словамі.

У з о р: *50 + 20 = 70. Да пяцідзесяці дадаць дваццаць — будзе семдзесят.*

| | | |
|---|---|---|
| 60 + 20 = | 200 + 600 = | 300 × 2 = |
| 90 – 30 = | 900 – 400 = | 700 : 10 = |

**376.** Прачытайце тэкст. Вызначце яго стыль. Перакладзіце тэкст з рускай мовы на беларускую. Запішыце, замяняючы лікі словамі.

**Спринт**

Спринт — это совокупность легкоатлетических беговых дисциплин на короткие дистанции (до 400 метров).

В группу беговых видов легкоатлетической программы входит бег на дистанции протяжённостью до 400 метров, а также различные виды эстафетного бега. Бег на 100, 200 и 400 метров, эстафетный бег 4 × 100 метров и 4 × 400 метров включается в программу Олимпийских игр. Дистанции протяжённостью 30, 50, 60 и 300 метров включаются в соревнования в закрытых помещениях *(По К. Гусеву)*.

*Слоўнік*

протяжённость — *працягласць*
соревнование — *спаборніцтва*

Каго з беларускіх спартсменаў-бегуноў называюць Белай Маланкай?

## § 61. Састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс

**377.** Прачытайце табліцу. Зрабіце вывад пра асаблівасці скланення састаўных колькасных лічэбнікаў.

| Склон | Скланенне састаўнога колькаснага лічэбніка |
|---|---|
| Н. | *пяцьсот шэсцьдзясят сем старонак* |
| Р. | *пяцісот шасцідзесяці сямі старонак* |
| Д. | *пяцістам шасцідзесяці сямі старонкам* |
| В. | *пяцьсот шэсцьдзясят сем старонак* |
| Т. | *пяцьюстамі шасцюдзесяццю сямю старонкамі* |
| М. | *(на) пяцістах шасцідзесяці сямі старонках* |



Правообладатель Национальный институт образования